УДК 327.33(476)(091)

П. В. Дзядзюля, дацэнт

# РОЛЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ АБ'ЯДНАННЯЎ У СТВАРЭННІ БССР

The article dwells upon some revolutionary changes in Russia in October 1917 and activities of social-political associations in formation of the BSSR.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. народы былой імперыі, кожны па-свойму, шукаюць шляхі да свабоды праз усведамленне сваёй нацыянальнай, гістарычнай, рэлігійнай самабытнасці. Па-новаму асэнсоўваюцца былыя крыўды, з болем успрымаюцца людскія, матэрыяльныя, культурныя страты, звязаныя з вайной.

Паўсюдна ўзнікаюць разнастайныя грамадска-палітычныя арганізацыі, аб'яднанні, мэтай якіх з'яўлялася выпрацоўка стратэгіі і тактыкі пабудовы нацыянальных дзяржаў.

Спроба беларусаў самаарганізавацца і вырашыць лёс Беларусі ўласнымі намаганнямі прывяла, як вядома, да разгону Усебеларускага з'езду, эміграцыі ўрада БНР і значнай часткі беларускай палітычнай, культурнай эліты. А яшчэ нядаўна У. Ленін пераконваў сваіх саратнікаў: «...не трэба баяцца асобных рэспублік. З пункту гледжання рабочых і сялян гэта не страшна. Няхай Расія будзе саюзам свабодных рэспублік» [1].

Дэкларацыя правоў народаў Расіі сцвярджала, што палітыка царызму павінна быць заменена адкрытай і сумленнай палітыкай, якая прывядзе да поўнага даверу народаў Расіі. Дзяржаўны дакумент абяцаў, што Савецкі ўрад у аснову сваёй дзейнасці ў нацыянальным пытанні пакладзе прынцыпы роўнасці і суверэнтнасці народаў Расіі, іх права на свабоднае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў [2].

Але кіраўнікі бальшавіцкіх арганізацый, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі, ігнаравалі дакументы партыйнага і дзяржаўнага цэнтра і лічылі сябе адзінымі правадзейнымі прадстаўнікамі працоўнага народа на нашай зямлі. Яшчэ 27 кастрычніка 1917 г. быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт пры Мінскім савеце. У пачатку лістапада ВРК стаў вышэйшым надзвычайным органам улады ў Беларусі і на фронце.

26 лістапада 1917 г. былі арганізаваны Абласны выканаўчы камітэт саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў і Савет народных камісараў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах і СНК). Як пісала газета М. Горкага «Новая жизнь», у Савеце народных камісараў Заходняга краю зусім няма мясцовых людзей. Савет гэты ўтвораны фронтам, але не краем, не мясцовымі жыхарамі.

Кіраўнікамі гэтых арганізацый сталі К. І. Ландар, В. В. Калмановіч, М. У. Рагазінскі, В. В. Каменшчыкаў, У. М. Фрэйман, А. Ф. Мяснікоў і інш. Газета «Звезда» ў гэты час прызнавалася, што аплотам бальшавікоў не толькі на фронце, але і ў тыле з'яўляецца спакутаная, зняважаная салдацкая маса. Салдаты ствараюць большасць ва ўсіх саветах Заходняй вобласці [3]. Абласныя ўлады ігнаравалі нацыянальнае пытанне наогул і не бачылі ў беларусах самастойнага народа.

Значная частка палітыкаў-беларусаў паступова ідэйна і арганізацыйна разышлася з дзеячамі, якія рыхтавалі Усебеларускі з'езд, стварылі Беларускую Народную Рэспубліку, шукала іншы шлях самавызначэння Беларусі. Яны шчыра паверылі ў магчымасць пабудовы нацыянальнай дзяржавы, апіраючыся на Савецкую ўладу.

Тысячы беларусаў па розных прычынах апынуліся ў прамысловых цэнтрах Расіі, дзе вялікую падтрымку мелі левыя палітычныя партыі. Многія выхадцы з Беларусі захапіліся бальшавіцкімі лозунгамі і пачалі далучацца да камуністычнага руху, ствараючы свае арганізацыі. Адной з іх была Беларуская СДРП, заснаваная восенню 1917 г. рабочымі Петраграда, матросамі Балтыйскага флоту і часткай членаў Беларускай сацыялістычнай грамады, якая адкалолася ад сваёй партыі. Для кіраўніцтва новай арганізацыяй быў выбраны камітэт у складзе А. Чарвякова, А. Усціловіча, У. Скарынкіна, Я. Лагуна і інш.

У сакавіку 1918 г. БСДП становіцца Беларускай секцыяй Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў). Гэта пашырыла магчымасці па стварэнні партыйных ячэек у многіх расійскіх гарадах, дзе кампактна пражывалі выхадцы з Беларусі [4]. А. Чарвякоў у гэты час, не прымаючы БНР і яе ідэі, робіць вывад, што «галоўным пунктам барацьбы між рэвалюцыйнымі і контррэвалюцыйнымі сіламі за далейшыя шляхі рэвалюцыі было нацыянальнае пытанне, а не пытанне аб уладзе» [5].

Партыя з першых дзён свайго існавання распачала актыўную дзейнасць. За кароткі час пачалі працаваць партыйная школа, Саюз моладзі, культурна-асветніцкія гурткі. Члены партыі працавалі з вайскоўцамі-беларусамі ў розных гарнізонах [6].

У ліпені 1918 г. адбыўся з'езд беларусаў-бежанцаў, на якім абмяркоўваліся самыя надзённыя праблемы жыцця найбольш абяздоленай часткі жыхароў Беларусі: матэрыяльная дапамога, рээвакуацыя, школьная справа, пакрыццё

страт ад вайны і іншыя пытанні. Дэлегацыя з'езда на чале з А. Усціловічам была прынята У. Леніным [7].

Бальшавіцкі ўрад імкнецца ўзяць пад кантроль нацыянальныя рухі і дазваляе ствараць ім кіруючыя органы. Узнікаюць арганізацыі палякаў, украінцаў, літоўцаў і інш. Карыстаюцца гэтым дазволам і беларусы. У студзені 1918 г. у Петраградзе па ініцыятыве БСДРП склікаецца нарада прадстаўнікоў левых беларускіх арганізацый. Яна выбірае Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам) і яго кіраўнікоў. Імі сталі А. Чарвякоў, У. Скарынка, З. Жылуновіч. 31 студзеня 1918 г. У. Ленін падпісвае дэкрэт, у якім адзначалася: «Пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцяў арганізуецца камісарыят па справах беларусаў. Камісарам па справах беларусаў назначаецца тав. Аляксандр Чарвякоў» [8].

З 3 сакавіка 1918 г. Белнацкам знаходзіўся ў Маскве, меў аддзяленні ў Петраградзе, Смаленску, Віцебску, Саратаве. Працавалі шматлікія яго аддзелы ў розных гарадах.

Супрацоўнікамі Белнацкама былі А. Грыневіч, З. Жылуновіч, Б. Тарашкевіч, Ф. Шантыр і многія іншыя. Нацыянальны камісарыят вёў палітычную і культурна-асветніцкую работу сярод беларусаў на тэрыторыі Расіі, клапаціўся пра бежанцаў. Заснаваў у Маскве Беларускі народны універсітэт і навукова-культурнае таварыства. Друкаваў газету «Дзянніца» – першую савецкую газету на беларускай мове. Выдаваў літаратуру на беларускай мове [9].

У верасні 1918 г. Белнацкам выступіў з праектам перайменавання Заходняй вобласці ў Беларуска-літоўскую. Вёў палеміку з дзеячамі Паўночна-Заходняга абкама РКП (б) і Абылвыкамзаха, якія выступалі супраць ідэі беларускай дзяржаўнасці. 25 снежня 1918 г. на экстраным пасяджэнні членаў камісіі ЦБ беларускіх секцый РКП (б) вызначыла спіс кандыдатаў у склад Часовага ўрада Беларускай савецкай рэспублікі. Тайным галасаваннем на пасаду старшыні намечаны З. Жылуновіч [10].

Праяўляюць актыўнасць і многія беларускія секцыі РКП (б). 4 жніўня 1918 г. беларусы-рабочыя Пуцілаўскага завода на сваім сходзе прымаюць рэзалюцыю з патрабаваннем перайменаваць Заходнюю вобласць у Беларускую і пастанаўляюць паслаць у Маскву дэлегацыю з мэтай давесці да СНК РСФСР пазіцыю рабочых.

13 жніўня 1918 г. беларусы-маракі Балтыйскага флоту ў рэзалюцыі, адрасаванай у СНК РСФСР, патрабуюць утварыць Беларускую вобласць з цэнтрам у Полацку, «старажытным асяродку самастойнага дзяржаўнага жыцця беларускага народа». Амаль адначасова з гэтай ініцыятывай Белнацкам падае ў Наркамац РСФСР падрыхтаваны ім канкрэтны «Праект дэкрэту аб утварэнні Беларускай вобласці» як часовай «аўтаномнай палітычнай адзінкі» ў складзе РСФСР і прыкладвае да яго «Тлумачальную запіску».

Белнацкам просіць дэкрэтам СНК РСФСР ліквідаваць Заходнюю вобласць, распусціць яе кіруючыя органы, якія «ўзніклі пры выпадковых акалічнасцях з вайсковых арганізацый фронту без удзелу беларускага народа». Кіраўнікі Белнацкама нагадваюць пра этнаграфічныя карты Беларусі акадэміка Я. Карскага і што беларусы павінны быць самастойнымі ў сваім дзяржаўным і палітыка-эканамічным жыцці [11].

Актыўнасць беларускіх камуністаў і іх прыхільнікаў у справе абвяшчэння БССР сустракае супраціўленне і непрыхільнасць з боку некаторых кіруючых прадстаўнікоў РКП (б) і Савецкай улады. А. Мяснікоў у той час у які ўжо раз паўтараў, што «патрабаванне самавызначэння народаў у Расіі – выдумка буржуазіі. Пабудова нацыянальных дзяржаў раней прыгнечаных народаў – з'ява рэакцыйная» [12].

3-ці абласны з'езд Саветаў, які працаваў у Смаленску 10–13 верасня, праігнараваў просьбу беларусаў перайменаваць Заходнюю вобласць у Беларускую і насуперак здароваму сэнсу назваў яе Заходняй Камунай.

22 снежня 1918 г. у Маскве канферэнцыя Беларускіх секцый РКП (б) пастанаўляе абвясціць БССР. Беларусы ведаюць, што кіраўніцтва РСФСР дазволіла стварыць сацыялістычную дзяржаўнасць Эстоніі, Літве, Латвіі.

24 снежня 1918 г. Сталін запрасіў да сябе кіраўнікоў Белнацкама і прапанаваў ім вылучыць кандыдатаў ва ўрад БССР. У гэты ж дзень ён паведамляе А. Мяснікову, што «ЦК партыі па многіх меркаваннях, пра якія цяпер гаварыць не выпадае, згадзіўся з беларускімі таварышамі на ўтварэнне Беларускага савецкага ўрада».

6-я Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП (б) пераносіцца з 27 на 30 снежня. Асобнага пытання пра абвяшчэнне БССР на парадку дня не было. Толькі ў даклад А. Мяснікова па пытанню «Бягучы момант» быў устаўлены пункт «Беларуская Савецкая рэспубліка».

30 снежня 1918 г. прымаецца агульная рэзалюцыя пра абвяшчэнне БССР з цэнтрам у Мінску. Тут жа вырашаецца тэрытарыяльнае пытанне, фарміруецца Часовы ўрад, 31 снежня была прынята пастанова аб перайменаванні канферэнцыі ў I з'езд КП(б)Б. 1 студзеня 1919 г. на пасяджэнні Часовага ўрада прымаецца Маніфест аб утварэнні БССР [13].

У Часовым урадзе рэспублікі беларусы-наркамы былі ў меншасці, але такое становішча істотнага значэння не мела. Ужо рыхтаваліся рашэнні, згодна якіх З. Жылуновіч і яго таварышы, абвінавачаныя ў нацыяналізме, будуць

выдалены з урада. Праз два тыдні пасля абвяшчэння БССР ЦК РКП (б) пастанаўляе адабраць ад БССР тры губерні – Віцебскую, Смаленскую, Магілёўскую і далучыць іх да РСФСР.

2–3 лютага 1919 г. у Мінску адбыўся з'езд Саветаў БССР. Ён зацвердзіў абвяшчэнне БССР і адначасова надаў «законнасць» адарванню ад яе трох губерняў, прыняў рашэнне аб зліцці БССР з Літоўскай ССР. Сталіцай новага ўтварэння стала Вільня, а ва ўрад новай рэспублікі не ўвайшоў ніхто з беларусаў [14].

У час савецка-польскай вайны Літбел перастала існаваць. Ва ўмовах польскай акупацыі 1 студзеня 1920 г. утварылася Беларуская камуністычная арганізацыя (БКА). Пасля адступлення палякаў 31 ліпеня 1920 г. з дазволу ЦК РКП (б) на сумесным пасяджэнні яшчэ існуючага ЦК КП (б) Літбела з прадстаўнікамі БКА, Бунда і прафсаюзаў Мінскай губерні была прынята «Дэкларацыя» аб другім абвяшчэнні БССР.

Уся ўлада, згодна дэкларацыі, перадавалася ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту, у які ўвайшлі А. Чарвякоў, Я. Адамовіч, В. Кнорын, У. Ігнатоўскі, А. Вайнштэйн. II з'езд Саветаў, які праходзіў 13–17 снежня 1920 г. у Мінску, узаконіў БССР і выбраў ЦВК на чале з А. Чарвяковым. У склад гэтай рэспублікі ўвайшлі 6 паветаў Мінскай губерні [15].

Беларускіх камуністаў чакала яшчэ працяглая барацьба за незалежнасць Беларусі. Але, як вядома, большасць з іх загінулі на гэтай нялёгкай сцяжыне падчас сваёй дзейнасці.

## Літаратура


1. Ленін У. ПСС. – Т. 32. – С. 256.
2. Круталевич В. А. Становление национальной державности. – Мн., 1999. – С. 18.
3. Літаратура і мастацтва. – 1991, 7 чэрвеня.
4. БелСЭ. – Мн., Т. 2. – С. 229–231; 260.
5. Чарвякоў А. За Савецкую ўладу. – Мн., 1927. – С. 34.
6. Турук Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов. – М., 1921. – С. 47–48.
7. ЭГБ: У 6 т. – Мн., 2003. – Т. 6. – С. 9.
8. Круталевич В. Рождение Белорусской советской республики. – Мн.: Наука и техника, 1975. – С. 287.
9. Турук Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов. – М., 1921. – С. 48; ЭГБ: У 6 т. – Мн., 1993. – Т. 1. – С. 448.
10. Там же.
11. Калубовіч А. Крокі гісторыі. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1993. – С. 97–98.
12. Круталевіч В. Пасля абвяшчэння рэспублікі // Полымя. – 1996. – № 9. – С. 129–130.
13. Советская Белоруссия. – 1991, 16, 18 июля; Ялугін Э. Без эпітафіі. – Мн.: Беларусь, 1989. – С. 135–136.
14. Калубовіч А. Крокі гісторыі. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1993. – С. 108–112; Спадчына. – 2000. – № 2. – С. 27–32.
15. БелСЭ. – Мн., 1974. – Т. 10. – С. 432.